# СРОДКІ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ Ў БЕЛАРУСКАЙ ДЫЯЛЕКТАЛОГІІ

*Аскальдовіч У.А.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Наўроцкая І.В. – магістр філ. навук*

У рабоце разглядаюцца пытанні прымянення беларускіх дыялектаў у інтэрактыўных дадатках, стварэнне новага віду мапы, а канкрэтна – дыялектнай. Узгадваецца гісторыя фарміравання груп гаворак, падаюцца асноўныя адрозненні адной групы гаворак ад другой. Актуальнасць дадзенай працы заключаецца ў тым, што ў нашы дні дыялекты – гэта рэлікт, паколькі новыя дыялекты не ўтвараюцца, разам з гэтым дыялектныя межы разбураюцца, дыялекты страчваюць мясцовыя асаблівасці.

Прадстаўляецца цікавым разгледзець, што ўяўляе сабой беларуская дыялектная мова і чым яна адрозніваецца ад літаратурнай.

Дыялектная мова з’яўляецца мовай народа, што пераважна выступае як мясцовая гаворка. Дыялектная мова складаецца з тэрытарыяльных гаворак, якія, у сваю чаргу, складаюцца з гаворак мясцовых. На карце дыялектаў можна ўбачыць, што на тэрыторыі Беларусі проціпастаўлены адзін аднаму два дыялекты, а іменна паўночна-ўсходні і паўднёва-заходні. Існуе група, якая спалучае ў сабе рысы як паўночна-ўсходняга, так і паўднёва-заходняга дыялектаў, а таксама мае і свае некаторыя спецыфічныя асаблівасці – гэта група сярэднебеларускіх гаворак, якую таксама называюць міждыялектнай. Менавіта гэтыя тры групы дыялектных гаворак і складаюць асноўны масіў сучаснай беларускай дыялектнай мовы. Акрамя таго, у яе склад уваходзіць яшчэ адасобленая група заходнепалескіх, ці брэсцка-пінскіх гаворак, паколькі яны маюць рад сваіх спецыфічных адрозненняў.

Літаратурная мова ўяўляе сабой, можна сказаць, вынік апрацоўкі ўсенароднай мовы, так званы «ўзорны варыянт». Асноўным адрозненнем ад гутарковай мовы з’яўляецца выразнасць і багацце моўных сродкаў, наяўнасць іх сістэматызаванасці і вызначаных нормаў. Гісторыя сучаснай літаратурнай беларускай мовы пачынаецца праз два стагоддзі пасля спынення старабеларускай пісьмовай традыцыі. Падчас новай эпохі для беларускай мовы пачынаецца яе адраджэнне і, паступова, на працягу пазамінулага і мінулага стагоддзяў на аснове гаворак складаецца новая мова літаратуры і публіцыстыкі. Гэта вельмі цесна звязана з тым, што ў гэты час хуткімі тэмпамі адбываецца фарміраванне беларускай нацыі.

У XIX — пачатку XX стст. друкуюцца навуковыя даследаванні, прысвечаныя гісторыі, фальклору, этнаграфіі, мове беларускага краю. Было выдадзена некалькі слоўнікаў беларускай мовы, сярод якіх асабліва вылучаецца «Слоўнік беларускай мовы» (1870) І. І. Насовіча.

Гаворкі беларускай народна-дыялектнай мовы адрозніваюцца адна ад адной характарам акання, наяўнасцю цвёрдага ***р*** у любой пазіцыі, змешваннем цвёрдага ***р*** з мяккім, наяўнасцю або адсутнасцю дыфтонгаў, дзеканнем і цеканнем, змешваннем ***ч*** і ***ц***, а таксама наяўнасцю пераходных гаворак у выніку суседства з палескімі, украінскімі і паўднёварускімі.

Цікавасць да гэтай тэмы ў тым ліку выклікана наяўнасцю зачыненнага на момант красавіка 2021 г. праекта «Інтэрактыўная мапа Беларусі». Закладзеная ідэя заключаецца ў развіцці нашай краіны як турыстычнага аб’екта для мясцовых і замежных жыхароў. І, як зразумела, галоўная мэта – даступна распавесці пра нашу краіну, яе самабытнасць і шматграннасць, каларыт. Дзякуючы такому «гіду ў кішэні» можна адкрыць Беларусь для сябе пад новым ракурсам.

Інфармацыю для праекта збіралі ў карэнных жыхароў шляхам апытання. Не дзіва, што кожны мясцовы можа расказаць шмат цікавага пра свой населены пункт. Усе напрамкі турызму цесна звязаны паміж сабой і дапамагаюць стварыць поўную карціну пра Беларусь.

Пры азнамленні з праектам узнікла думка паспрабаваць стварыць штосьці накшталт такой мапы, але замест турыстычных аб’ектаў размясціць на мапе групы дыялектаў і спецыфічныя гаворкі.

Рэалізацыя праекта такога кшталту дазволіць павялічыць цікавасць насельніцтва да дыялекталогіі, асабліва ў галіне інфармацыйных тэхналогій. Увогуле, інфармацыйныя тэхналогіі равіваюцца вельмі хуткімі

тэмпамі і дапамагаюць рэалізаваць рознага віду праекты, у тым ліку – стварэнне інтэрактыўнай дыялектнай мапы.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Праект “Інтэрактыўная мапа Беларусі”. [Электронны рэсурс]. - Рэжым доступу: http: ulej.by - Дата доступу: 11.03.2021.*

*2. Наўроцкая, І. В. Беларуская мова : культура маўлення. Электронны вучэбна-метадычны комплекс [Электронны рэсурс] / І. В. Наўроцкая. - Мінск : Электронная бібліятэка БДУІР, 2013.*